Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і інтэрнацыяналізацыі адукацыі
_______________ В. П. Кочын
24.06 _______________ 2024 г.
Рэгістрацыйны №УД-166 ФДО/вуч.

*Беларуская мова*

**Вучэбная праграма для беларускіх грамадзян, якія засвойваюць адукацыйныя праграмы падрыхтоўкі да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове «Праграмы ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, 2024 год», зацверджанай загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 10.11.2023 г. № 500.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Г.М. ДАВЫДАВА**, старшы выкладчык кафедры агульнаадукацыйных дысцыплін

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай агульнаадукацыйных дысцыплін
(пратакол № 13 ад 27.06.2024)

Саветам Інстытута дадатковай адукацыі
(пратакол № 6 ад 27.06.2024)

Загадчык кафедры ________________ Ірына Анатольеўна Біруля

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм падрыхтоўкі навучэнцаў да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь (падрыхтоўчае аддзяленне для беларускіх грамадзян, падрыхтоўчыя курсы для беларускіх грамадзян) накіраваны на пераадоленне разрыву паміж узроўнем падрыхтоўкі навучэнцаў і патрабаваннямі, якія прад`яўляюць абітурыентам падчас здачы ўступных іспытаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** «Беларуская мова» – даць ўяўленне пра структуру і функцыянаванне беларускай моўнай сістэмы, сфарміраваць разуменне заканамернасцей і нарматыўнага выкарыстання граматычных і лексічных сродкаў беларускай літаратурнай мовы.

Веданне мовы для паступлення ў навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь прадугледжвае ўменне арыентавацца ў лексіка-граматычнай сістэме літаратурнай мовы з мэтай далейшага яе выкарыстання ў грамадскай і прафесійнай камунікацыі.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны**.

1. Паўтарыць, абагульніць і сістэматызаваць веды аб сістэме мовы і маўлення.
2. Удасканаліць арфаэпічныя, арфаграфічныя, лексічныя і камунікатыўна-маўленчыя ўменні і навыкі.
3. Замацаваць веды аб лексіка-граматычнай сістэме беларускай літаратурнай мове з мэтай іх трывалага выкарыстання ў вусных і пісьмовых зносінах.

**Месца вучэбнай дысцыпліны.** У сістэме падрыхтоўкі абітурыентаў да паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі абгульненне, сістэматызацыя і паглыбленне ведаў па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская мова» дазволіць навучэнцам паспяхова здаць ўступныя іспыты ў форме цэнтралізаванага экзамена і цэнтралізаванага тэсціравання.

Вучэбная праграма складзена з улікам міжпрадметных **сувязей** і праграм па дысцыпліне «Руская мова»

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова» навучэнец павінен:

**ведаць**:

– нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, арфаграфічныя, лексічныя, фразеалагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя);

– фанетычную сістэму і фанетычныя з’явы беларускай мовы; асаблівасці вымаўлення галосных, зычных гукаў і іх спалучэнняў;

– адназначныя і мнагазначныя словы, сінонімы, амонімы, антонімы,

паронімы; прыметы фразеалагізмаў, іх значэнне і сінтаксічную ролю;

– марфемную будову слова, словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы; віды асноў; асноўныя спосабы ўтварэння слоў;

– паняцці марфалогіі, класіфікацыю часцін мовы; марфалагічныя прыметы розных часцін мовы;

– сінтаксічныя адзінкі, іх тыпы.

– прыметы тэксту, спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак тэксту, функцыянальныя стылі маўлення, тыпы маўлення і іх кампазіцыйныя схемы;

**умець**:

– адрозніваць гукі і літары, устанаўліваць паміж імі адпаведнасць;

– вызначаць лексічнае значэнне слоў; размяжоўваць значэнні мнагазначных слоў, размяжоўваць значэнні амонімаў; падбіраць да слоў сінонімы, антонімы; адрозніваць лексічнае значэнне паронімаў; выяўляць фразеалагізмы ў сказах, тэкстах, тлумачыць іх значэнне, вызначаць сінтаксічную ролю, правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце;

– вызначаць марфемную будову і спосаб утварэння слоў; правільна пісаць словы з арфаграмамі, абумоўленымі марфемнай будовай слова;

– распазнаваць часціны мовы ў сказах, тэкстах на аснове іх сэнсава-граматычных прымет і сінтаксічнай ролі;

– знаходзіць і выпраўляць арфаграфічныя памылкі;

– вызначаць віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях, сінтаксічную функцыю слоў (словазлучэнняў) у сказе;

– выяўляць у сказах сінтаксічныя канструкцыі, якія патрабуюць выдзялення знакамі прыпынку; знаходзіць і выпраўляць пунктуацыйныя памылкі;

– успрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці, афармляць у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– рабіць сэнсавы і кампазіцыйны аналіз тэксту: вызначаць прыметы тэксту, фармуляваць яго тэму і асноўную думку, даваць загаловак; вызначаць спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце; вызначаць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага тыпу і стылю маўлення;

**валодаць**:

– арфаграфічнай, пунктуацыйнай, маўленчай пісьменнасцю ў аб’ёме, дастатковым для нязмушанага выкарыстання беларускай мовы з вучэбнымі мэтамі ў вуснай і пісьмовай формах.

## Структура вучэбнай дысцыпліны

Дысцыпліна вывучаецца ў I і II семестрах вучэбнага курса. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова» адводзіцца : 204 гадзіны для вочнай формы атрымання дадатковай адукацыі, у тым ліку 204 аўдыторныя гадзіны, з іх: практычныя заняткі – 204 гадзіны; кантрольныя

работы – 4, у тым ліку: I семестр – 2 кантрольныя работы; II семестр – 2 кантрольныя работы. Залік – 1 (I семестр); экзамен – 1 (II семестр).

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 5,6 зал. адз.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі падрыхтоўчых курсаў: агульная колькасць гадзін складае – ад 21 да 96 гадзін, у тым ліку аўдыторных – ад 21 да 96, з іх практычных заняткаў – ад 21 да 96. Форма прамежкавага кантролю ведаў– кантрольныя работы – ад 4 да 14.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Раздзел 1.
### Фанетыка і арфаэпія

**Тэма 1.1.** Фанетыка і арфаэпія. Гукі беларускай мовы.

Гукі беларускай мовы.арфаэпічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы: нормы беларускага літаратурнага вымаўлення (вымаўленне галосных, зычных і спалучэнняў зычных).

**Тэма 1.2.** Суадноснасць гукаў і літар. Склад і націск.

Суадноснасць гукаў і літар. Прызначэнне і гукавое значэнне літар е, ё, ю, я, і.

Роля націску пры адрозненні слоў і некаторых формаў слоў. Акцэнталагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

### Раздзел 2.
### Арфаграфія

**Тэма 2.** Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Правапіс галосных о, э, а; е, ё, я. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах. Прыстаўныя галосныя, іх правапіс.

**Тэма 2.2. Зычныя гукі.**

Зычныя цвёрдыя, мяккія, зацвярдзелыя; глухія, звонкія, санорныя; свісцячыя і шыпячыя. Іх вымаўленне і правапіс. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў зычных. Зычныя [д]–[д͡з’], [т]–[ц’], іх вымаўленне і правапіс. Прыстаўныя і ўстаўныя зычныя, іх правапіс. Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

**Тэма 2.3. Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.**

Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.

**Тэма 2.4. Правапіс вялікай і малой літар.**

Правапіс вялікай і малой літар.

**Тэма 2.5**. **Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна.**

Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна.

## Раздзел 3.
## Лексіка. Фразеалогія

**Тэма 3.1. Лексіка.**

Слова, яго лексічнае значэнне. Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнні слоў. Амонімы, іх адрозненне ад мнагазначных слоў. Сінонімы і антонімы, іх роля ў маўленні. Паронімы. Лексічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Тэма 3.2. Фразеалогія.**

Фразеалагізмы, іх роля ў маўленні. Фразеалагічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Раздзел 4.
## Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія

**Тэма 4.1. Марфемная будова слова.**

Марфемы як структурна значымыя часткі слова. Аснова слова. Канчатак, нулявы канчатак. Корань. Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго ж слова. Чаргаванне галосных і зычных у аснове слова. Правапіс прыставак. Правапіс *ы, і, й* пасля прыставак. Словаўтваральныя і формаўтваральныя марфемы.

**Тэма 4.2. Словаўтварэнне і арфаграфія.**

Асноўныя спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны, бяссуфіксны (нульсуфіксальны), постфіксальны, асноваскладанне, словаскладанне, абрэвіяцыя. Складаныя словы, іх утварэнне і правапіс. Складанаскарочаныя словы, іх утварэнне і правапіс. Словаўтваральныя і арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Раздзел 5.
## Марфалогія і арфаграфія

**Тэма 5.1. Назоўнік.**

Часціны мовы як лексіка-граматычныя разрады слоў. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Пераход слоў адных часцін мовы ў іншыя. Назоўнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назоўнікаў. Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя. Назоўнікі канкрэтныя і абстрактныя, зборныя, рэчыўныя, іх лексічныя і граматычныя прыметы. Род назоўнікаў. Назоўнікі мужчынскага роду, якія ўжываюцца для абазначэння асоб мужчынскага і жаночага полу. Назоўнікі агульнага роду.

Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Лік назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Склон назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў па склонах. Асновы назоўнікаў. Назоўнікі 1-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў. Назоўнікі 2-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў. Назоўнікі 3-га скланення, правапіс іх склонавых канчаткаў. Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў множнага ліку. Скланенне ўласных назоўнікаў. Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі. Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі -ак-, -ык-, -ік-, -ачк-, -ечк-; мяккі знак перад суфіксамі -к-, -чык- і ў суфіксах -аньк-, -еньк-. Складаныя назоўнікі, іх утварэнне і правапіс. Правапіс *не* (*ня*)*, ні* з назоўнікамі.

**Тэма 5.2. Прыметнік.**

Прыметнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне. Утварэнне, ужыванне і правапіс прыналежных прыметнікаў. Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Спосабы ўтварэння прыметнікаў. Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання і правапіс. Правапіс прыметнікаў з суфіксам -ск-. Правапіс -н-, -нн- у прыметніках. Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў. Правапіс не (ня-) з прыметнікамі.

**Тэма 5.3. Лічэбнік.**

Лічэбнік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады лічэбнікаў паводле будовы, значэння і граматычных прымет. Род і лік некаторых лічэбнікаў. Скланенне, ужыванне і правапіс колькасных і парадкавых лічэбнікаў. Спалучальнасць зборных лічэбнікаў у беларускай мове.

**Тэма 5.4. Займеннік.**

Займеннік як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Скланенне і правапіс займеннікаў.

**Тэма 5.5. Дзеяслоў.**

Дзеяслоў як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў), яе сінтаксічная роля. Трыванні дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трываняў.

Лады дзеяслова. Дзеясловы абвеснага, умоўнага і загаднага ладу, іх значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс. Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых формаў дзеяслова. Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў.

Рознаспрагальныя дзеясловы. Спосабы ўтварэння дзеясловаў.

Правапіс дзеясловаў з суфіксамі -ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-. Правапіс не (ня-) з дзеясловамі.

Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавымі зваротамі. Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу -н-, -ен-, -ан-, -т-. Правапіс не (ня-) з дзеепрыметнікамі.

Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі. Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне і правапіс. Ужыванне дзеепрыслоўяў. Правапіс не (ня-) з дзеепрыслоўямі.

**Тэма 5.6. Прыслоўе.**

Прыслоўе як самастойная часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Ступені параўнання якасных прыслоўяў, іх утварэнне і ўжыванне. Утварэнне прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў. Правапіс не (ня-), ні з прыслоўямі.

**Тэма 5.7. Прыназоўнік.**

Прыназоўнік як службовая часціна мовы. Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі. Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх правапіс. Ужыванне прыназоўнікаў у словазлучэннях, якія перадаюць асаблівасці кіравання ў беларускай мове.

**Тэма 5.8. Злучнік.**

Злучнік як службовая часціна мовы. Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне. Адзіночныя, парныя, паўторныя злучнікі, іх ужыванне і правапіс.Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне.

**Тэма 5.9. Часціца.**

Часціца як службовая часціна мовы. Правапіс часціц. Часціцы не і ні, іх ужыванне і правапіс. Выклічнік як асобая часціна мовы. Правапіс выклічнікаў. Знакі прыпынку ў сказах з выклічнікамі.

**Тэма 5.10. Выклічнік.**

Выклічнік як асобая часціна мовы. Правапіс выклічнікаў. Знакі прыпынку ў сказах з выклічнікамі.

## Раздзел 6.
## Сінтаксіс і пунктуацыя

**Тэма 6.1. Словазлучэнне.**

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні. Віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэнні. Класіфікацыя словазлучэнняў па галоўным слове. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай).

**Тэма 6.2. Просты сказ.**

Сказ як асноўная сінтаксічная адзінка. Тыпы сказаў па структуры, мэце выказвання і інтанацыі. Знакі прыпынку ў канцы сказаў. Просты сказ. Парадак слоў у сказе. Развітыя і неразвітыя сказы. Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, спосабы іх выражэння. Просты дзеяслоўны выказнік. Састаўны дзеяслоўны і састаўны іменны выказнікі. Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага спалучэннем слоў. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам. Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння. Аднасастаўныя сказы, іх будова. Няпоўныя сказы. Працяжнік у няпоўным сказе. Сказы з аднароднымі членамі. Аднародныя і неаднародныя азначэнні. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа. Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (з абагульняльнымі словамі і без іх). Сказы са звароткамі. Спосабы выражэння звароткa. Неразвітыя і развітыя звароткі. Знакі прыпынку ў сказах са звароткамі. Сказы з пабочнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі. Сказы з устаўнымі канструкцыямі. Знакі прыпынку ў сказах з устаўнымі канструкцыямі. Сказы з адасобленымі членамі. Сказы з адасобленымі азначэннямі (дапасаванымі, недапасаванымі) і прыдаткамі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі азначэннямі і прыдаткамі. Сказы з адасобленымі дапаўненнямі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі дапаўненнямі. Сказы з адасобленымі акалічнасцямі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі акалічнасцямі. Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі. Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі. Сказы з параўнальнымі зваротамі. Знакі прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі

**Тэма 6.3. Складаны сказ.**

Складаны сказ. Сінтаксічныя прыметы складанага сказа. Сродкі сувязі частак складанага сказа. Тыпы складаных сказаў. Складаназлучаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах. Складаназалежныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы як сродкі сувязі частак складаназалежнага сказа. Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснай часткай месца, часу, умовы, прычыны,

мэты, уступальнай, параўнальнай, спосабу дзеяння, меры і ступені. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах. Бяззлучнікавыя складаныя сказы, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, іх сінтаксічныя прыметы, будова. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

**Тэма 6.4. Простая і ўскосная мова.**

Простая і ўскосная мова як спосабы перадачы чужой мовы. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай. Правілы замены простай мовы на ўскосную. Дыялог, яго афармленне на пісьме. Цытаты, іх афармленне на пісьме. Сінтаксічныя і пунктуацыйныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

## Раздзел 7. Маўленне. Тэкст. Стылістыка.

**Тэма 7.1. Маўленне.**

Паняцці «мова» і «маўленне». Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо. Культура вуснага і пісьмовага маўлення. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

**Тэма 7.2. Тэкст.**

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Прыметы тэксту: сэнсавая цэласнасць, тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць. Загаловак. Спосабы (віды) і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце.

**Тэма 7.3. Стылістыка.**

Тыпы маўлення (апісанне, апавяданне, разважанне), іх кампазіцыйныя схемы. Функцыянальныя стылі маўлення (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы), стылеўтваральныя моўныя сродкі. Стылістычныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

# 1. ВУЧЭБНА- МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вочная форма атрымання дадатковай адукацыі з выкарыстаннем ІКТ

| Номер раздела, темы | Название раздела, темы | Количество аудиторных часов | | | | | Количество часов УСР | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практические занятия | Семинарские занятия | Лабораторные занятия | Иное | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. | | | | | | | |
| 1.1. | Гукі беларускай мовы. | | 6 | | | | | |
| 1.2. | Склад і націск. | | 6 | | | | | тэст |
| 2. | АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 2.1. | Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | | 6 | | | | | |
| 2.2. | Зычныя гукі. | | 8 | | | | | тэст |
| 2.3. | Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа. | | 2 | | | | | |
| 2.4. | Правапіс вялікай і малой літар. | | 2 | | | | | |
| 2.5. | Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. | | 2 | | | | | Кантрольная работа № 1 з выкарыстаннем ІКТ |
| 3. | ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. | | | | | | | |
| 3.1. | Лексіка. | | 6 | | | | | |
| 3.2. | Фразеалогія. | | 6 | | | | | тэст |
| 4. | МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ | | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1. | Марфемная будова слова. | | 8 | | | | | тэст |
| 4.2. | Словаўтварэнне і арфаграфія. | | 4 | | | | | Кантрольная работа № 2<br>з выкарыстаннем ІКТ |
| 5. | МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 5.1. | Назоўнік. | | 16 | | | | | тэст |
| 5.2. | Прыметнік. | | 10 | | | | | тэст |
| 5.3 | Лічэбнік. | | 8 | | | | | тэст |
| 5.4 | Займеннік. | | 6 | | | | | |
| 5.5. | Дзеяслоў. | | 6 | | | | | |
| | Усяго за I семестр | | 102 | | | | | Залік |
| 5.5. | Дзеяслоў. | | 12 | | | | | тэст |
| 5.6. | Прыслоўе. | | 6 | | | | | тэст |
| 5.7. | Прыназоўнік. | | 2 | | | | | |
| 5.8. | Злучнік. | | 2 | | | | | тэст |
| 5.9.<br>5.10. | Часціца.<br>Выклічнік. | | 4 | | | | | Кантрольная работа № 3<br>з выкарыстаннем ІКТ |
| 6. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ | | | | | | | |
| 6.1. | Словазлучэнне. | | 6 | | | | | тэст |
| 6.2. | Просты сказ. | | 34 | | | | | тэст |
| 6.3. | Складаны сказ. | | 26 | | | | | Кантрольная работа № 4<br>з выкарыстаннем ІКТ |
| 6.4. | Простая і ўскосная мова | | 4 | | | | | |
| 7. | МАЎЛЕННЕ. ТЭКСТ, СТЫЛІСТЫКА. | | | | | | | |
| 7.1. | Маўленне. | | 2 | | | | | тэст |
| 7.2. | Тэкст. | | 2 | | | | | |
| 7.3. | Стылістыка. | | 2 | | | | | |
| | Усяго за II семестр | | 102 | | | | | Экзамен |
| | УСЯГО | | 204 | | | | | |

## 2. ВУЧЭБНА- МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вочная форма атрымання дадатковай адукацыі

| омер раздела, темы | Название раздела, темы | Количество аудиторных часов | | | | | Количество часов УСР | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практические занятия | Семинарские занятия | Лабораторные занятия | Иное | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. | | | | | | | |
| 2.1. | Гукі беларускай мовы. | | 3 | | | | | тэст |
| 1.2. | Склад і націск. | | 3 | | | | | тэст |
| 2. | АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 2.1. | Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | | 3 | | | | | тэст |
| 2.2. | Зычныя гукі. | | 3 | | | | | тэст |
| 2.3.<br>2.4.<br>2.5. | Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа. Правапіс вялікай і малой літар. Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 1 |
| 3. | ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ | | | | | | | |
| 3.1. | Лексіка. | | 3 | | | | | тэст |
| 3.2. | Фразеалогія. | | 3 | | | | | тэст |
| 4. | МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ | | | | | | | |
| 4.1. | Марфемная будова слова. | | 3 | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.2 | Словаўтварэнне і арфаграфія. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 2 |
| 5. | МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 5.1. | Назоўнік. | | 9 | | | | | тэст |
| 5.2. | Прыметнік. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 3 |
| 5.3. | Лічэбнік. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.4. | Займеннік. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.5. | Дзеяслоў. | | 6 | | | | | Кантрольная работа № 4 |
| 5.6. | Прыслоўе. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.7.<br>5.8.<br>5.9.<br>5.10. | Прыназоўнік.<br>Злучнік.<br>Часціца.<br>Выклічнік. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 5 |
| 6. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ | | | | | | | |
| 6.1. | Словазлучэнне. | | 3 | | | | | тэст |
| 6.2.. | Просты сказ. | | 18 | | | | | Кантрольная работа № 6 |
| 6.3. | Складаны сказ | | 12 | | | | | Кантрольная работа № 7 |
| 6.4. | Простая і ўскосная мова | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 8 |
| 7. | МАЎЛЕННЕ.ТЭКСТ. СТЫЛІСТЫКА. | | | | | | | |
| 7.1.<br>7.2.<br>7.3. | Маўленне.<br>Тэкст.<br>Стылістыка. | | 3 | | | | | тэст |
| | УСЯГО | | 96 | | | | | |

## 3. ВУЧЭБНА- МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вочная форма атрымання дадатковай адукацыі

| Номер раздела, темы | Название раздела, темы | Количество аудиторных часов | | | | | Количество часов УСР | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практические занятия | Семинарские занятия | Лабораторные занятия | Иное | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. | | | | | | | |
| 1.1. | Гукі беларускай мовы. | | 3 | | | | | тэст |
| 1.2. | Склад і націск. | | 3 | | | | | тэст |
| 2. | АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 2.1. | Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | | 3 | | | | | тэст |
| 2.2. | Зычныя гукі. | | 3 | | | | | тэст |
| 2.3.<br>2.4.<br>2.5. | Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.<br>Правапіс вялікай і малой літар.<br>Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 1 |
| 3. | ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. | | | | | | | |
| 3.1. | Лексіка. | | 3 | | | | | тэст |
| 3.2. | Фразеалогія. | | 3 | | | | | тэст |
| 4. | МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ | | | | | | | |
| 4.1. | Марфемная будова слова. | | 3 | | | | | тэст |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.2. | Словаўтварэнне і арфаграфія. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 2 |
| 5. | МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 5.1. | Назоўнік. | | 6 | | | | | тэст |
| 5.2. | Прыметнік. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.3. | Лічэбнік. | | 3 | | | | | |
| 5.4. | Займеннік. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 3 |
| 5.5. | Дзеяслоў. | | 6 | | | | | тэст |
| 5.6. | Прыслоўе. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.7.<br>5.8.<br>5.9.<br>5.10. | Прыназоўнік.<br>Злучнік.<br>Часціца.<br>Выклічнік. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 4 |
| 6. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ | | | | | | | |
| 6.1. | Словазлучэнне. | | 3 | | | | | |
| 6.2. | Просты сказ. | | 12 | | | | | Кантрольная работа № 5 |
| 6.3. | Складаны сказ | | 9 | | | | | Кантрольная работа № 6 |
| 6.4. | Простая і ўскосная мова. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 7 |
| 7. | МАЎЛЕННЕ.ТЭКСТ. СТЫЛІСТЫКА. | | | | | | | |
| 7.1.<br>7.2.<br>7.3. | Маўленне.<br>Тэкст.<br>Стылістыка. | | 3 | | | | | тэст |
| | УСЯГО | | 84 | | | | | |

# 4. ВУЧЭБНА- МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вочная форма атрымання дадатковай адукацыі

| Номер раздела, темы | Название раздела, темы | Количество аудиторных часов | | | | | Количество часов УСР | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практические занятия | Семинарские занятия | Лабораторные занятия | Иное | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. | | | | | | | |
| 1.1.<br>1.2. | Гукі беларускай мовы.<br>Склад і націск. | | 3 | | | | | тэст |
| 2. | АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 2.1.<br>2.2. | Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.<br>Зычныя гукі. | | 3 | | | | | тэст |
| 2.3.<br>2.4.<br>2.5. | Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.<br>Правапіс вялікай і малой літар.<br>Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 1 |
| 3. | ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. | | | | | | | |
| 3.1.<br>3.2. | Лексіка.<br>Фразеалогія. | | 3 | | | | | тэст |
| 4. | МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ | | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4.1.<br>4.2 | Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія. | | 3 | | | | | тэст |
| 5. | МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 5.1. | Назоўнік. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.2.<br>5.3.<br>5.4 | Прыметнік<br>Лічэбнік.<br>Займеннік. | | 3 | | | | | тэст |
| 5.5 | Дзеяслоў. | | 3 | | | | | |
| 5.6.<br>5.7.<br>5.8.<br>5.9.<br>5.10. | Прыслоўе.<br>Прыназоўнік.<br>Злучнік.<br>Часціца.<br>Выклічнік. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 3 |
| 6. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. | | | | | | | |
| 6.1. | Словазлучэнне. | | 3 | | | | | тэст |
| 6.2. | Просты сказ. | | 3 | | | | | тэст |
| 6.3.<br>6.4. | Складаны сказ.<br>Простая і ўскосная мова. | | 6 | | | | | Кантрольная работа № 4 |
| 7. | МАЎЛЕННЕ. ТЭКСТ. СТЫЛІСТЫКА. | | | | | | | |
| 7.1.<br>7.2.<br>7.3. | Маўленне.<br>Тэкст.<br>Стылістыка. | | 3 | | | | | тэст |
| | УСЯГО | | 42 | | | | | |

## 5. ВУЧЭБНА- МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Завочная форма атрымання дадатковай адукацыі з выкарыстаннем ІКТ

| Номер раздела, темы | Название раздела, темы | Количество аудиторных часов | | | | | Количество часов УСР | Форма контроля знаний |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекции | Практические занятия | Семинарские занятия | Лабораторные занятия | Иное | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. | | | | | | | |
| 1.1.<br>1.2. | Гукі беларускай мовы.<br>Склад і націск. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 1 з выкарыстаннем ІКТ |
| 2. | АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 2.1.<br>2.2.<br>2.3.<br>2.4.<br>2.5. | Арфаграфічныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.<br>Зычныя гукі.<br>Правапіс у і ў. Правапіс мяккага знака і апострафа.<br>Правапіс вялікай і малой літар.<br>Правапіс слоў разам, праз злучок і асобна. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 2 з выкарыстаннем ІКТ<br>Кантрольная работа № 3 з выкарыстаннем ІКТ<br>Кантрольная работа № 4 з выкарыстаннем ІКТ |
| 3.<br>4. | ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. МАРФЕМНАЯ БУДОВА СЛОВА. СЛОВАЎТВАРЭННЕ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 3.1.<br>3.2.<br>4.1.<br>4.2. | Лексіка.<br>Фразеалогія..<br>Марфемная будова слова.<br>Словаўтварэнне і арфаграфія. | | 3 | | | | | Кантрольная работа № 5 з выкарыстаннем ІКТ<br>Кантрольная работа № 6 з выкарыстаннем ІКТ |
| | | | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 5. | МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ. | | | | | | | |
| 5.1.5.2.<br>5.3.<br>5.4.<br>5.5.<br>5.6.<br>5.7.<br>5.8.<br>5.9.<br>5.10. | Назоўнік. Прыметнік.<br>Лічэбнік .<br>Займеннік.<br>Дзеяслоў.<br>Прыслоўе.<br>Прыназоўнік.<br>Злучнік.<br>Часціца.<br>Выклічнік. | | 6 | | | | | Кантрольная работа № 7<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 8<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 9<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 10<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 11<br>з выкарыстаннем ІКТ |
| 6.<br>7. | СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ.<br>МАЎЛЕННЕ. ТЭКСТ. СТЫЛІСТЫКА | | | | | | | |
| 6.1.<br>6.2.<br>6.3.<br>6.4.<br>7.1<br>7.2<br>7.3. | Словазлучэнне.<br>Просты сказ.<br>Складаны сказ.<br>Простая і ўскосная мова.<br>Маўленне.<br>Тэкст.<br>Стылістыка. | | 6 | | | | | Кантрольная работа № 12<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 13<br>з выкарыстаннем ІКТ<br><br>Кантрольная работа № 14<br>з выкарыстаннем ІКТ |
| | УСЯГО | | 21 | | | | | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Пералік асноўнай літаратуры

1. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: у 2 ч. Ч. 1 / Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2019. – 147 с.

2. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 5 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання: у 2 ч. Ч. 2 / Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2019. – 149 с.

3. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 6 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2020. – 245 с.

4. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2020. – 244 с.

5. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 8 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2020. – Рэжым доступу: https://uchebniki.by/bel/katalog/5-9-klassy/id01986 – Дата доступу: 22.06.2024.

6.Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2019. – 219 с.

7. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання /Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2020. – 230 с.

8. Беларуская мова: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)/ Г. М. Валочка [і інш.] – Мінск: Нац. Ін-т адукацыі, 2021. – Рэжым доступу: https://uchebniki.by/bel/katalog/10-11-klassy/id02157. – Дата доступу: 22.06.2024.

9. Беларуская мова: сінтаксіс, пунктуацыя, стылістыка [Электронны рэсурс]: вучэб. -метад. дапам. / Г. М. Давыдава, В.А. Тарасевіч. – Мінск; БДУ, 2019. – Рэжым доступу: https://elib.bsu.by/handle/123456789/229725. – Дата доступу: 22.06.2024.

10. Беларуская мова: электронны вучэбна-метадычны комплекс для слухачоў факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ / Г.М. Давыдава; БДУ, Фак. Даўніверсітэцкай адукацыі, Каф. Даўніверсітэцкай падрыхтоўкі. – Мінск: БДУ, 2018. – 159 с.: табл. – Бібліягр.: с. 156-159. – Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/206222. – Дата доступу: 22.06.2024.

## Пералік дадатковай літаратуры

1.Сіўковіч, В. М. Беларуская мова ў пытаннях і адказах: дапаможнік для вучняў старшых класаў і абітурыентаў/ В. М. Сіўковіч. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2021. – 584 с.

2. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова: Зборнік тэстаў/ Рэсп. Ін-т кантролю ведаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск: Аверсэв, 2023. – 24 с.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі і методыка фарміравання выніковай адзнакі

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца з мэтай даць магчымасць навучэнцам ацаніць ступень засвойвання зместу беларускай мовы, неабходнага для паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, і вызначыць эфектыўнасць іх вучэбнай дзейнасці ў працэсе вывучэння гэтай вучэбнай дысцыпліны.

Формы прамежкавай атэстацыі па дысцыпліне «Беларуская мова» згодна з вучэбным планам – дзве кантрольныя работы і залік у першым семестры, у другім семестры – дзве кантрольныя работы  і экзамен.

Кантрольныя работы № 1, № 2, № 3, № 4, залік, экзамен праводзяцца ў форме пісьмовага тэсціравання. Час выканання работы – дзве акадэмічныя гадзіны.

Методыка фарміравання выніковай адзнакі: вынікі ацэньваюцца адзнакамі ў балах па дзесяцібальнай шкале; станоўчымі з’яўляюцца адзнакі не ніжэй за 4 (чатыры) балы.

Сістэма балаў размеркавана наступным чынам:

1) за кожнае цалкам правільна выкананае заданне налічваецца 2,5 бала;
2) колькасць правільна выкананых заданняў памнажаецца на 2,5 бала;
3) атрыманая сума – колькасць балаў за ўвесь тэст;
4) колькасць балаў суадносіцца з адпаведнай адзнакай.

| балы | адзнака |
|---|---|
| 1-7 | 1 |
| 8-15 | 2 |
| 16-24 | 3 |
| 25-41 | 4 |
| 42-50 | 5 |
| 51-63 | 6 |
| 64-75 | 7 |
| 76-85 | 8 |
| 86-98 | 9 |
| 99-100 | 10 |

## Інавацыйныя падыходы ў выкладанні вучэбнай дысцыпліны

Пры выкладанні беларускай мовы *эўрыстычны метад* выкарыстоўваецца пераважна пры рашэнні лінгвістычных задач на практычных занятках: слухачам прапануюцца моўныя факты, тлумачэнне якім яны даюць самастойна або з дапамогай арфаграфічных слоўнікаў.

*Даследчы падыход* навучання рэалізуецца пры разнастайных відах аналізу тэкстаў (графіка-арфаграфічнага / фанетычнага; лексіка-граматычнага / марфалагічнага).

*Практыка-арыентаваны* напрамак маюць заданні на стылістычнае тлумачэнне з’яў сучаснай літаратурнай мовы, на мадэліраванне праблемнай сітуацыі пры выяўленні памылак вучняў.

## Пералік пытанняў да экзамену/заліку

### Пытанні да заліку

1. Фанетыка.
2. Арфаэпія.
3. Арфаграфія. Культура маўлення
4. Лексіка.
5. Фразеалогія.
6. Марфемная будова слова.
7. Словаўтварэнне і арфаграфія.
8. Марфалогія і арфаграфія (назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік).

### Пытанні да экзамену

1. Фанетыка.
2. Арфаэпія.
3. Арфаграфія. Культура маўлення
4. Лексіка.
5. Фразеалогія.
6. Марфемная будова слова.
7. Словаўтварэнне і арфаграфія.
8. Марфалогія і арфаграфія.
9. Сінтаксіс і пунктуацыя. Простая і ўскосная мова.
10. Маўленне. Тэкст. Стылістыка

**ДАДАТАК 1**

## Пералік вучэбных планаў, у адпаведнасці з якімі складзены вучэбна- метадычныя карты дысцыпліны

Вучэбна- метадычныя карты складзены ў адпаведнасці:

1. з вучэбнымі планамі падрыхтоўчага аддзялення для беларускіх грамадзян (дзённая форма навучання) па праграмах 12х12х12, 12х6х12, 12х12, 12х6, 12х6х6 (рэг. № 173, 174, 175, 176, 177 ад 17.05.2024);
2. з вучэбнымі планамі падрыхтоўчых курсаў на 2024-2025 вучэбны год (праграмы 32х3х12, 32х3х6) Вучэбнага цэнтра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі (рэг. №159, 160 ад 22.03.2024);
3. з вучэбнымі планамі падрыхтоўчых курсаў дыферэнцыйнага навучання на 2024-2025 вучэбны год (праграмы 28х3х8, 28х3х3) Вучэбнага цэнтра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі ( рэг.№ 164, 166 ад 22.03.2024).
4. з вучэбнымі планамі падрыхтоўчых курсаў на 2024-2025 вучэбны год (праграмы 14х3х10, 14х3х6, 14х3х3) Вучэбнага цэнтра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі (рэг. № 161,162, 163 ад 22.03.2024);
5. з вучэбнымі планамі падрыхтоўчых курсаў (з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій) на 2024-2025 вучэбны год (праграма 7х3х2)) Вучэбнага цэнтра даўніверсітэцкай падрыхтоўкі (рэг. № 167 ад 22.03.2024).

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы установы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Руская мова | кафедра агульнаадукацыйных дысцыплін | Няма | Змен не патрабуецца, (пратакол №13 ад 27.06.2024) |

## ДОПОЛНЕНИЯ И ИЗМЕНЕНИЯ К УЧЕБНОЙ ПРОГРАММЕ ПО ИЗУЧАЕМОЙ УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЕ

**на 2025-2026 учебный год**

| № п/п | Дополнения и изменения | Основание |
|---|---|---|
| 1 | Обновление информационно-методической части учебной программы | Включение пособия Давыдава, Г. М. Беларуская мова : марфалогія і арфаграфія [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. дапам. / Г. М. Давыдава. – Мінск : БДУ, 2024. – 161 с. |

Учебная программа пересмотрена и одобрена на заседании кафедры общеобразовательных дисциплин (протокол №13 от 25.06.2025г. )

Заведующий кафедрой
кандидат педагогических наук ________________ И.А.Бируля

УТВЕРЖДАЮ
Директор-декан ИДО
кандидат филологических наук
доцент ________________ П.И. Навойчик